*УДК 94(476)«1920/1930»+338.43(476)(091)«1920/1930»*

# ТРАНСФОРМАЦИЯ ЕДИНОЛИЧНОГО КРЕСТЬЯНСКОГО ХОЗЯЙСТВА В БЕЛАРУСИ В 1920–30-х гг.

***С. Н. ХОДИН*** [1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

На примере белорусской советской деревни рассмотрены процессы трансформации единоличного крестьянского хозяйства в Беларуси в 1920–30-х гг. Анализируется влияние природно-географического и логистического факторов на углубление специализации сельского хозяйства Беларуси. Определены этапы экономической политики, исследованы формирование экономического сознания крестьянства и его воздействие на изменения в экономическом поведении этой категории населения. Подробно изучена трансформация форм землепользования в БССР на протяжении 1920–30-х гг. Проанализированы альтернативы единоличного хозяйства, прослежено развитие подсобного хозяйства в условиях коллективизации. Указаны особенности модернизационных процессов в Беларуси в межвоенный период.

***Ключевые слова:*** процессы трансформации; единоличное крестьянское хозяйство; природно-географический фактор и логистический фактор; специализация сельского хозяйства; этапы экономической политики; экономическое сознание; экономическое поведение крестьянства; трансформация форм землепользования; альтернативы развития; коллективизация.

# ТРАНСФАРМАЦЫЯ АДЗІНААСОБНАЙ СЯЛЯНСКАЙ ГАСПАДАРКІ Ў БЕЛАРУСІ Ў 1920–30-я гг.

***С. М. ХОДЗІН*** [1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

На прыкладзе беларускай савецкай вёскі разглядаюцца працэсы трансфармацыі адзінаасобнай сялянскай гаспадаркі ў Беларусі ў 1920–30-я гг. Аналізуецца ўплыў прыродна-геаграфічнага і лагістычнага фактараў на паглыбленне спецыялізацыі сельскай гаспадаркі Беларусі. Вызначаюцца этапы эканамічнай палітыкі, даследуюцца фарміраванне эканамічнай свядомасці сялянства і яе ўздзеянне на змены ў эканамічных паводзінах гэтай катэгорыі насельніцтва. Падрабязна разглядаецца трансфармацыя форм землекарыстання вяскоўцаў на працягу 1920–30-х гг. Аналізуюцца альтэрнатывы адзінаасобнай гаспадаркі, прасочваецца развіццё падсобнай гаспадаркі ва ўмовах калектывізацыі. Акрэсліваюцца асаблівасці мадэрнізацыйных працэсаў у Беларусі ў міжваенны час.

***Ключавыя словы:*** працэсы трансфармацыі; адзінаасобная сялянская гаспадарка; прыродна-геаграфічны фактар і лагістычны фактар; спецыялізацыя сельскай гаспадаркі; этапы эканамічнай палітыкі; эканамічная свядомасць; эканамічныя паводзіны сялянства; трансфармацыя форм землекарыстання; альтэрнатывы развіцця; калектывізацыя.

**Образец цитирования:**
Ходзін СМ. Трансфармацыя адзінаасобнай сялянскай гаспадаркі ў Беларусі ў 1920–30-я гг. *Часопіс Беларускага дзяржанага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2019;1:67–75.

**For citation:**
Khodzin SM. Transformation of individual peasant economy in Belarus in 1920–30s. *Journal of the Belarusian State University. History.* 2019;1:67–75. Belarusian.

**Автор:**
***Сергей Николаевич Ходин*** – доктор исторических наук, доцент; профессор кафедры источниковедения исторического факультета.

**Author:**
***Siarhei M. Khodzin***, doctor of science (history), docent; professor at the department of source study, faculty of history.
*skhodzin@mail.ru*

Журнал Белорусского государственного университета. История. 2019;1:67–75
Journal of the Belarusian State University. History. 2019;1:67–75

# TRANSFORMATION OF INDIVIDUAL PEASANT ECONOMY IN BELARUS IN 1920–30s

***S. M. KHODZIN***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

With the example of the Belarusian Soviet village, processes of transformation of the individual peasant economy in Belarus in 1920–30s are considered. The influence of natural-geographical and logistical factors that have contributed to the deepening of agricultural specialization in Belarus is analyzed. The economic policy phases are determined, the formation of economic awareness and its impact on changes in the economic behavior of the peasantry are investigated. The transformation of land use forms in BSSR during the 1920–30s has been studied in detail. The alternatives to the development of individual peasant economy have been reviewed and the development of subsidiary farms in the context of collectivization have been considered. The features of modernization processes in Belarus in the interwar period are determined.

***Key words:*** transformation processes; individual peasant economy; natural-geographical factor; logistical factor; agricultural specialization; economic policy phases; economic awareness; economic behavior of the peasantry; transformation of land use forms; alternative to the development; collectivization.

Важнай умовай паспяховага развіцця сялянскай гаспадаркі з'яўляецца ўлік прыродна-геаграфічнага і лагістычнага фактараў. Каб наладзіць культурную гаспадарку, якая дае канкурэнтаздольную прадукцыю на ўнутраным і знешнім рынках, трэба было правесці новае эканамічнае раяніраванне з улікам гістарычных абставін, асаблівасцей эвалюцыі сялянскай гаспадаркі, шчыльнасці насельніцтва, транспартных шляхоў, коштаў на тавары сельскагаспадарчай вытворчасці, а таксама сацыяльна-псіхалагічнага фактару. Значную навуковую і практычную работу ў гэтым кірунку рэалізаваў Навукова-даследчы інстытут сельскай і лясной гаспадаркі і непасрэдна А. А. Смоліч. Праведзенае ім даследаванне паказала, што асноўныя прычыны нізкай прыбытковасці сялянскай гаспадаркі абумоўлены недахопам сродкаў вытворчасці, адсутнасцю зберажэнняў і інвестыцый селяніна ў сваю гаспадарку, высокімі падаткамі. У сярэдзіне 1920-х гг. у БССР была рэалізавана вялікая праца па раяніраванні, якую М. І. Калінін прыводзіў у якасці прыкладу для ўсяго СССР. Пры гэтым А. А. Смоліч настойваў на неабходнасці ўліку глебавых, гідралагічных, кліматычных і іншых прыродных умоў. Істотным фактарам з яго пункта гледжання з'яўлялася таксама лагістыка: наяўнасць буйных гарадоў, чыгуначных станцый і г. д.

Нягледзячы на тое што сялянства атрымала прырэзку зямлі каля 1 млн дзесяцін, для Беларусі вельмі востра заставалася праблема аграрнай перанаселенасці, лішак рабочай сілы даходзіў тут да 40 %[1]. Падчас калектывізацыі звярталася ўвага на тое, што ў сярэдзіне 1920-х гг. «падзел сялянскіх гаспадарак дасягнуў неверагодных памераў. Кожны год павялічвалася колькасць дробных сялянскіх гаспадарак на 15 000, у той час як у першыя гады пасля рэвалюцыі яна ўзрастала на 8000»[2] (тут і далей пераклад наш. – *С. Х.*). У густанаселеных ці малазямельных раёнах недахоп зямлі пазбаўляў сялянскую сям'ю магчымасці рэалізаваць сваю рабочую сілу ва ўмовах аптымальных форм арганізацыі працы. Не валодаючы дастатковым запасам зямлі і сродкаў вытворчасці для поўнага выкарыстання сваёй працы ў сельскай гаспадарцы, сяляне займаліся і іншымі відамі гаспадарчай дзейнасці, у прыватнасці адыходніцтвам. У Беларусі спроба пераадолець аграрную перанаселенасць выяўлялася і ў пашырэнні больш працаёмкіх культур і адпаведных сельскагаспадарчых галін (бульбаводства, ільнаводства), а таксама ў развіцці жывёлагадоўлі і падсобных промыслаў [1, с. 82–107].

Савецкая статыстыка прыводзіла даволі істотныя лічбы росту пагалоўя жывёлы. Аднак зыходныя даныя падаваліся ў параўнанні з 1916 г. – годам ваенным і для жывёлагадоўлі неспрыяльным. Што ж датычыцца дынамікі яе развіцця ў 1920-х гг., то, паводле статыстычнага даведніка, у 1923 г. налічвалася 911 743 каровы, а ў 1926 г. – 1 126 273 [2, с. 187]. Неспрыяльная сітуацыя складвалася з кармамі і якасцю жывёлы. Вельмі марудна адраджалася свінагадоўля[3]. Адной з найважнейшых праблем, як вынік ваеннага ліхалецця, з'яўляліся хваробы жывёлы. Па сцвярджэнні наркама земляробства БССР Д. Ф. Прышчэпава, Віцебскім бактэрыялагічным інстытутам была наладжана вытворчасць сывараткі з разлікам на 40 тыс. галоў [3]. Гэта праца, безумоўна, патрабавала шмат часу, асабліва ў тых умовах.

У сярэдзіне 1920-х гг. адбывалася паглыбленне спецыялізацыі сельскай гаспадаркі Беларусі

[1]НАРБ. Ф. 4п. Оп. 1. Д. 2295. (Документы о состоянии сельского хозяйства и очередных задачах аграрной политики в БССР (доклады, тезисы докладов, сведения, выводы и др.). 18 февраля – 31 июля 1925 г.). Л. 112.

[2]Стенограмма XIV съезда КП(б)Б от 26 [27] января 1932 г. // НАРБ. Ф. 4п. Оп. 1. Д. 5590. Л. 551.

[3]НАРБ. Ф. 4п. Оп. 1. Д. 2295. (Документы о состоянии сельского хозяйства и очередных задачах аграрной политики в БССР (доклады, тезисы докладов, сведения, выводы и др.). 18 февраля – 31 июля 1925 г.). Л. 41.

ў кірунку да мяса-малочнай жывёлагадоўлі і вырошчвання тэхнічных культур. Пэўныя поспехі былі дасягнуты ў развіцці птушкагадоўлі. Развіццё рыначных адносін праз механізмы цэн стымулявала дадзеную тэндэнцыю. Па разліках эканамістаў на аснове бюджэтных абследаванняў, вытворчасць збожжа была прыбытковай толькі для буйных (ад 8,1 да 16 дзесяцін) высокатаварных гаспадарак. Для асноўнай масы гаспадарак (ад 2 да 8 дзесяцін) сабекошт пуда збожжа ў рублях у 1924/25 гаспадарчым годзе быў ніжэй рыначнай цаны толькі па такіх культурах, як лён і бульба [1, с. 228]. У наступным годзе рыначныя цэны на жыта і авёс узраслі. Пры гэтым узровень механізацыі вырошчвання і збору бульбы, а таксама тэхнічных культур заставаўся самым нізкім. Згодна са звесткамі «Перспектыўнага плана развіцця сельскай і лясной гаспадаркі БССР», працаёмкія культуры – лён, каноплі, бульба – былі больш распаўсюджаны ў бядняцкіх гаспадарках, кармавыя і збожжавыя – у заможных. Кароў на гаспадарку больш было ў беднякоў. Аднак вывад складальнікаў «Перспектыўнага плана развіцця сельскай і лясной гаспадаркі БССР» аб больш эфектыўным развіцці жывёлагадоўлі ў бядняцкіх гаспадарках бачыцца памылковым. Жывёла ва ўмовах малаўрадлівых глеб Беларусі разглядалася пераважна як вытворца ўгнаенняў [3]. Як адзначаў І. А. Кіслякоў, у Калінінскай і Бабруйскай акругах памяншалася значэнне жывёлагадоўлі і ўзмацнялася роля земляробства. Але ў раслінаводстве большае развіццё атрымалі інтэнсіўныя культуры (лён, бульба) [4, с. 97–98]. Сялянства Бабруйскай акругі скардзілася ва ўладныя структуры на тое, што з прычыны высокіх падаткаў няма магчымасці гадаваць жывёлу[4].

Праведзены прафесарам П. П. Маславым аналіз даказваў, што аднаўленчы працэс у сельскай гаспадарцы адбываўся пераважна за кошт экстэнсіўных фактараў – павелічэння затрат жывой працы, пашырэння землекарыстання і іншых рэсурсаў, якія да сярэдзіны 1920-х гг. былі ўжо вычарпаны [5]. Не назіралася і росту таварнай прадукцыі. Тыповая серадняцкая гаспадарка заставалася напалову натуральна-спажывецкай. Узрастала спажыванне хлеба самімі сялянамі, а таксама павялічваліся выдаткі на корм жывёле [6; 7]. У 1928 г. у сувязі з гэтым Д. Ф. Прышчэпаў пісаў: «І не дзіва, што сучасная наша таварнасць ніжэйшая, чым яна была ў дарэвалюцыйны час; безумоўна, што на гэтым адбіваецца значна павялічанае пасля рэвалюцыі харчаванне самога сялянства. Такі ўзрост сельскай гаспадаркі, які пакуль што ідзе ў жывот, нас задаволіць не можа таму, што недахоп прадуктаў сельскагаспадарчай вытворчасці, магчыма, адаб'ецца на рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі»[5] [8, с. 54].

На думку Д. Ф. Прышчэпава, інтэнсіфікацыя і развіццё сельскай гаспадаркі цалкам залежалі ад развіцця прамысловасці. Ужо на X з'ездзе КП(б)Б у студзені 1927 г. Д. Ф. Прышчэпаў звяртаў увагу на тое, што прамысловасць БССР на той час перапрацоўвала толькі 40 % таварнай прадукцыі сельскай гаспадаркі. Між тым у вёсцы адзначаўся велізарны лішак працоўнай сілы, было дастаткова энергетычных рэсурсаў (велізарныя тарфяныя запасы). Наркам земляробства адкінуў абвінавачванне ў тым, што «мы не ведаем, куды ідзе развіццё сельскай гаспадаркі», і засведчыў, што яна рухаецца па шляху да вытворчай кааперацыі. Аднак вытворчую кааперацыю ён разумеў не толькі як калгасна-саўгасную вытворчасць, але і як пэўны інтэгральны кааператыў, які ўключае таксама цэлы шэраг форм спецыяльнай кааперацыі. Кааперацыя, па меркаванні Д. Ф. Прышчэпава, павінна была вырастаць з ініцыятывы вяскоўцаў. «Гэта не кармавая рэпа, якую вясною пасадзілі, а восенню яна ўжо вырасла… На натуральна-спажывецкім фундаменце сялянскай гаспадаркі кааперацыя не будзе развівацца», – сцвярджаў наркам земляробства[6].

Рыначныя адносіны паміж вытворцамі і спажыўцамі прадукцыі ва ўмовах традыцыйнага недаверу сялян да горада патрабавалі ад улад стварэння новых механізмаў мадэрнізацыі, аднак гэта супярэчыла класавым падыходам, якія акрэсліваліся бальшавіцкай партыяй. Рыначны тып паводзін мае больш магчымасцей і перспектыў, але для яго рэалізацыі неабходна выкананне шэрагу ўмоў як з боку дзяржавы, так і з боку індывіда. Сяляне з'яўляліся не самымі лепшымі прадпрымальнікамі. Яны аддавалі перавагу правераным стагоддзямі традыцыйным формам агракультуры. На думку Б. М. Міронава, «сяляне працавалі менавіта столькі, колькі неабходна было для задавальнення ўласных патрэб» [9, с. 411]. Разам з тым даследаванні, праведзеныя прафесарам М. П. Макаравым, паказалі, што хутарскія гаспадаркі мелі істотную перавагу над калектыўнымі ў тых сферах вытворчасці, дзе пераважала не тэхнічнае забеспячэнне, а зацікаўленасць у выніках працы («біялагічныя працэсы») [10].

Заўважнай рысай эканамічнай палітыкі 1920-х гг. была спроба яе навуковага абгрунтавання. Менавіта ў гэты час складваюцца навуковыя беларускія школы ў галіне аграрных навук [11]. Сярод найбольш яркіх іх прадстаўнікоў можна назваць С. В. Скандракова, Е. Л. Ярашчука, Г. І. Гарэцкага, А. А. Смоліча, І. А. Кіслякова. Хоць іх погляды і фарміраваліся

[4]Справаздача аб дзейнасці Бабруйскага акруговага выканаўчага камітэта Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў за 1926/27 і 1927/28 гг.: III Бабруйскаму акруговаму з'езду Саветаў. Бабруйск : [б. в.], 1929. С. 18.

[5]Тут і далей цытаты прыводзяцца ў адпаведнасці з нормамі сучаснай арфаграфіі. – *С. Х.*

[6]Стенограмма X съезда КП(б)Б от 3–10 января 1927 г. // НАРБ. Ф. 4п. Оп. 1. Д. 3083. Л. 550–551.

пад уплывам расійскіх школ, аднак гэтыя вучоныя выразна выяўлялі імкненне вывучаць і ўлічваць асаблівасці і традыцыі Беларусі як асобнай гаспадарчай сістэмы. Крытыкуючы А. В. Чаянава за вузкі тэхніка-эканамічны падыход, І. А. Кіслякоў пісаў: «Землеўпарадкаванне, застаючыся само па сабе актам эканоміка-тэхнічным, з'яўляецца разам з тым з'явішчам сацыяльна і эканамічна абумоўленым па ўсіх лініях». Па яго меркаванні, «расійская ўніверсітэцкая землеўпарадчая навука да гэтага часу ігнаруе пасялковую форму землекарыстання» [4, с. 130].

Неабходна адрозніваць тэрміны «парадак землекарыстання» (абшчынны і падворны) і «формы землекарыстання». У сваёй працы А. І. Кіслякоў вызначыў чатыры формы землекарыстання: 1) хутарскую; 2) пасялковую; 3) адрубную; 4) калектыўную. Разам з тым хутары і пасёлкі вызначаюцца і як від населенага пункта. Каб падкрэсліць індустрыяльны характар пасёлка (ці аб'ём насельніцтва ў ім), да тэрміна «пасёлак» пачалі дадаваць азначэнне «гарадскі». Разам з хутарамі зніклі таксама такія найменні, як «пагост», «двор». На пачатку 1920-х гг. у сялянскім асяроддзі можна было пачуць такія назвы відаў населеных пунктаў, як «засценак», «выселкі», «слабада», якія па вызначаных І. А. Кісляковым характарыстыках былі блізкімі да пасёлкаў [4, с.11].

Вяртанне ў склад БССР шэрагу тэрыторый Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў прадвызначыла распаўсюджанне тут беларускага заканадаўства. Галоўнае яго адрозненне ад расійскага заключалася ў адмаўленні ад абшчыннай формы землекарыстання, а таксама ў тым, што не дапускаліся ўраўняльныя перадзелы. Зямля замацоўвалася ў пастаяннае працоўнае карыстанне за паселішчамі і іншымі гаспадарчымі аб'яднаннямі і за асобнымі працоўнымі землекарыстальнікамі з дня выдачы дакументаў.

Землеўпарадкаванне на хутары не мела вызначальнага ўплыву на развіццё калгаснага руху ў Беларусі. Частка хутарскіх гаспадарак па меры неабходнасці аб'ядноўвалася ў калектыўныя гаспадаркі. Так, у Віцебскай акрузе, дзе працэнт хутароў быў найвышэйшы, значную долю складалі аб'яднаныя ў калектывы хутарскія гаспадаркі, якія ўзніклі пераважна пасля кастрычніка 1917 г. Адной з прычын рэпрэсій супраць Д. Ф. Прышчэпава (як вядома, ён быў названы Чырвоным Сталыпіным) найперш з'яўлялася незалежная зямельная палітыка ў БССР, у тым ліку і ў дачыненні да абшчыны. Аднак ці настолькі супрацьстаялі хутары і абшчына? Нямецкая даследчыца Д. Зіберт сцвярджае, што «там, дзе абшчына з'яўлялася больш моцнай, працэс хутарызацыі быў больш паспяховым, чым у тых раёнах, дзе практыкавалася падаткаабкладанне асобных гаспадарак» [12]. Гісторык Л. П. Ліпінскі тлумачыць гэта адсутнасцю ілюзій наконт адмены незнаёмага ў тых месцах зямельнага перадзелу [13]. Аднак аднаго гэтага фактару для тлумачэння недастаткова, бо ў беларускіх раёнах вакол Гомеля, дзе існавала абшчына, працэнт хутарызацыі быў неістотным. Можна меркаваць, што пераважную ролю адыгрывалі іншыя фактары, найперш прыродна-геаграфічныя. У лясістай частцы паўночна-ўсходняй Беларусі хутары і адрубы стымуляваліся і прыкладамі паспяховага гаспадарання ў сумежных латышскіх тэрыторыях.

Зямельны кодэкс БССР 1923 г. гарантаваў сялянам, якія карысталіся зямлёй у хутарской і адрубной формах, тыя ж юрыдычныя правы, што і калектывам, дазваляў свабодны пераход да гэтых форм землекарыстання шляхам выдзялення з зямельнага таварыства асобных гаспадарак, у тым ліку праз размеркаванне ўсёй зямлі таварыства на хутары і адрубы. На 1 студзеня 1925 г. каля 25 % сялянскіх гаспадарак БССР размяшчаліся на хутарах і адрубах. Аднак бяднейшая частка сялянства нават пры моцным жаданні для пераходу на хутары не мела сродкаў на перанос сваёй сядзібы на новае месца і аплату землеўпарадкавальных работ. Не магла гэтыя выдаткі цалкам кампенсаваць і разбураная вайной дзяржава. У гэтых умовах нараджаліся новыя сацыяльныя супярэчнасці. Таму шэраг навукоўцаў, у прыватнасці А. А. Смоліч, прапаноўвалі менавіта для бяднейшага сялянства выкарыстоўваць магчымасці вытворчых форм сельскагаспадарчай кааперацыі з падтрымкай дзяржавы.

У сітуацыі, калі калектыўныя гаспадаркі не набылі вялікага аўтарытэту сярод беларускага сялянства, кіраўніцтва Наркамата земляробства БССР у другой палове 1920-х гг. рэкамендавала кампрамісную форму – невялікія кааперaваныя пасёлкі з прымусовым севазваротам. Дзеля гэтага выкарыстоўваліся дадатковае зямельнае забеспячэнне, ільготы пры вызначэнні платы за землеўпарадкаванне і інш. За перыяд 1922–1927 гг. на тэрыторыі БССР былі створаны пасёлкі на плошчы 590 434 га, што складала 29 % ад усёй землеўпарадкаванай за гэты час плошчы сялянскага землекарыстання. Найбольш распаўсюджанай пасялковая форма стала ў Гомельскай, Магілёўскай, часткова Мінскай і Бабруйскай акругах. У Віцебскай, Аршанскай, Полацкай акругах пераважалі хутары [10].

На Пленуме ЦК КП(б)Б 3 мая 1925 г. першы сакратар партыі сцвярджаў, што ў гаспадарчай палітыцы і практычнай рабоце на вёсцы занадта шмат перажыткаў ваеннага камунізму і найпершай задачай «з'яўляецца цяпер рост накаплення ў вёсцы, узбагачэння дробнага гаспадара»[7]. У спрэчцы з Д. Ф. Прышчэпавым А. І. Крыніцкі заклікаў дзейнічаць больш рашуча ў ажыццяўленні

[7] Стенограмма заседания пленума ЦК КП(б)Б от 2–8 мая 1925 г. // НАРБ. Ф. 4п. Оп. 1. Д. 1992. Л. 2–3.

патрабаванняў сялянства, «не чакаць, пакуль загрукочуць кранштацкія гарматы»[8]. На IX з'ездзе КП(б)Б, які адбыўся ў снежні 1925 г., адзначалася: «...да гэтага часу сялянства не ведае, якая з форм землекарыстання самая выгадная для яго. Мы не можам цяпер сказаць, да прыкладу, што пасялковы настрой з'яўляецца настроем большасці сялянства, і зараз сялянства кідаецца ад хутарской да пасялковай, ад пасёлкаў да хутароў»[9]. Разам з тым многія партыйныя і савецкія кіраўнікі, якія раней імкнуліся вызначыцца ў справе калектыўнага земляробства, цяпер спяшаліся адрапартаваць вышэйшым органам пра поспехі ў развіцці хутарской гаспадаркі.

У 1924–1926 гг. у ходзе ажыццяўлення агульнай для цэнтральнай і ўсходняй частак Беларусі землеўпарадкавальнай палітыкі значная перавага аддавалася пасёлкам. Паводле плана развіцця сельскай гаспадаркі на другую палову 1920-х гг., яны павінны былі скласці адну чвэрць усіх форм землекарыстання. Наркамат земляробства БССР вызначыў задачу «як мага менш перасоўваць насельніцтва» [14]. У выдадзенай гэтай установай брашуры «Сельская гаспадарка Беларускай ССР і мерапрыемствы па яе аднаўленні» (1925) адзначалася, што рассяленне на хутары, нават калі яны і былі б найбольш дасканалай формай землекарыстання, – мера нясвоечасовая і для многіх гаспадарак разбуральная.

Кіраўніцтва Наркамата земляробства БССР на чале з Д. Ф. Прышчэпавым у другой палове 1920-х гг. мусіла манеўрыраваць паміж эканамічнымі патрэбамі дзяржавы і ідэаламі сацыяльнай роўнасці, дэклараванымі кампартыяй. З пункта гледжання перспектыў павелічэння сельскагаспадарчай вытворчасці, зніжэння сабекошту прадукцыі і ўліку схільнасцей сялянства найбольш эфектыўнай формай была хутарская гаспадарка. Калі на пасёлках і адрубах вытворчасць лёну для сялян не прыносіла даходу і з'яўлялася стратнай, хутаране мелі да 40–45 % прыбытку. Спецыяльная камісія, якая даследавала ў 1928 г. стан сялянскай гаспадаркі ў розных рэгіёнах БССР, адзначала, што ва ўмовах пераважна хутарскога землекарыстання сельскагаспадарчая вытворчасць у Віцебскай акрузе развівалася больш інтэнсіўна [15]. Даследчык М. П. Макараў таксама лічыў хутары найбольш эфектыўнымі формамі індывідуальнага землекарыстання. Па рацыянальнасці выкарыстання зямельнай плошчы ён ставіў хутары вышэй за іншыя формы арганізацыі гаспадаркі, у тым ліку калгасы. Але, згодна з тагачаснай ідэалогіяй, эфектыўнасць участковых форм землекарыстання была звязана з сацыяльнымі вынікамі, непрымальнымі для сацыялістычнага грамадства. У якасці альтэрнатыўных форм разгляdaліся калгасы і саўгасы. Па ўраджайнасці збожжавых яны маглі паспаборнічаць з хутарскімі гаспадаркамі. Але ў 1920-я гг. сельская гаспадарка Беларусі арыентавалася на вытворчасць не збожжа, а лёну, бульбы, мяса і малака, дзе хутаране былі па-за канкурэнцыяй.

У другой палове 1920-х гг. працягвалася землеўпарадкаванне хутароў, якія існавалі фактычна. У 1926 г. з усіх хутарскіх гаспадарак рэспублікі 25,6 % былі створаны да 1917 г., астатнія – у 1920-х гг., з іх 23,2 % – на падворна-цераспалосных землях у ходзе землеўпарадкавання, больш за 50 % – на былых памешчыцкіх землях, атрыманых сялянамі пасля 1917 г. У 1926 г. у Аршанскай акрузе ўзнікла больш за 33 % хутароў у параўнанні з іншымі формамі землекарыстання, у Віцебскай – каля 75 %. Распаўсюджанай з'явай стала арганізацыя малазямельным сялянствам на землях дзяржаўнай маёмасці калектыўных гаспадарак з наступным імкненнем рассяліцца на хутары. Па выбарачным перапісе 1927 г., хутарскія гаспадаркі складалі каля 20 % усіх наяўных гаспадарак, іх высокая ўдзельная вага назіралася ў паўночнай і паўночна-ўсходняй частках БССР. У матэрыялах да даклада Савета Народных Камісараў БССР Савету Народных Камісараў СССР канстатаваліся адсутнасць у 1928 г. абшчыны і «шырокае распаўсюджанне надворна-ўчастковай формы землекарыстання, у тым ліку хутарской і адрубной, як істотнага адрознення БССР ад РСФСР» [16, с. 48–49].

Другая палова 1920-х гг. характарызуецца імкненнем дзяржавы павялічыць прыбыткі за кошт сялянства. Пэўным выключэннем у гэтым плане стаў 1926 г., калі падатак быў паменшаны, але адначасова ў падаткаабкладанне сельскагаспадарчага насельніцтва ўносіліся змены. У далейшым ён спаганяўся не толькі з натуральных элементаў гаспадаркі, але і з даходу. Абкладанню падлягаў прыбытак і ад асноўных, і ад другасных заняткаў. У выніку адзіны сельскагаспадарчы падатак з 1927 г. пашыраўся з асноўных аб'ектаў (зямля, лугі і буйная жывёла) і на свінаводства, прамысловае садаводства, агародніцтва і пчалаводства, а таксама на неземляробчыя заняткі насельніцтва. Ад падатку вызваляліся батракі, рабочыя, якія працавалі на выбарчых пасадах, а таксама медыцынскі персанал, ветэрынары, настаўнікі, суддзі, міліцыя, работнікі лясніцтваў і некаторыя іншыя катэгорыі вясковага насельніцтва. У параўнанні з 1926/27 гаспадарчым годам колькасць гаспадарак, прыцягнутых да падаткаабкладання, павялічылася на 1,5 %[10].

[8]Стенограмма заседания пленума ЦК КП(б)Б от 2–8 мая 1925 г. 104 л. // НАРБ. Ф. 4п. Оп. 1. Д. 1992. Л. 91–97.
[9]НАРБ. Ф. 4п. Оп. 1. Д. 1983. (Протоколы и стенограмма IX съезда КП(б)Б, приветствие съезду. 8–12 декабря 1925 г.). Л. 65.
[10]Отчет НКФ об исполнении Гос. бюджета БССР за 1926–1927 гг. // НАРБ. Ф. 4п. Оп. 1. Д. 2732. Л. 17 об. – 18.

імкненне не абкладаць выпадковыя даходы і заахвочваць агратэхнічныя новаўвядзенні, развіццё дадатковых заробкаў сялянства, абкладанне паляводства па плошчы раллі, а не паводле плошчы пасеву, павінна было, па задумцы ініцыятараў, падштурхнуць да інтэнсіфікацыі гаспадарання[11]. Аднак вынікі сельскагаспадарчай вытворчасці 1926/27 гаспадарчага года засведчылі зніжэнне валавой прадукцыі па ўсіх асноўных галінах, за выключэннем жывёлагадоўлі, пры некаторым павелічэнні неземляробчых даходаў насельніцтва. У выніку прырост прадукцыі сельскай гаспадаркі склаў толькі 8 % (у папярэднім годзе – амаль 51 %). За 1926/27 гаспадарчы год паступіла 8 061 370 руб. сельскагаспадарчага падатку замест планаваных 8 345 738 руб. (96,6 %)[12].

У маі 1927 г. А. І. Крыніцкага змяняе В. Г. Кнорын, які ўжо меў вопыт практычнай работы ў Беларусі. Заява В. Г. Кнорына на адкрыцці ХІ з'езда ЦК КП(б)Б 22 лістапада 1927 г. сведчыла аб тым, што прадчуванне магчымай вайны прысутнічала не толькі ў сялянскіх чутках: «СССР пераможа і ў вайне, якая мае адбыцца, адваюе права на сацыялістычнае будаўніцтва ў нашай краіне»[13]. Акцэнт на мабілізацыю ўсіх сродкаў і сіл у ваеннага пакалення разумеўся як найважнейшая палітычная задача. Сродкі, неабходныя для мадэрнізацыі горада, магчыма было ўзяць толькі з вёскі. Асэнсоўвалася і важнасць падтрымкі ўлады сярэднім сялянствам, колькасць якога павялічылася. У прыватнасці, В. Г. Кнорын падкрэсліваў: «Найважнейшае для нас – адносіны серадняка: з кім ідзе серадняк – з намі ці супраць нас, і цэнтральным пытаннем у нашай палітыцы было, застаецца і ёсць – заваяваць на бок савецкай улады серадняка, павесці яго ў саюзе з беднатой. І паставіць на чале гэтага саюза бедняка»[14]. Варта заўважыць, што такая лінія прадвызначыла раскол вёскі, яна супярэчыла сялянскаму менталітэту. Гэтыя супярэчнасці адлюстроўваліся найперш у падатковай палітыцы, якая ў 1920-х гг. з'яўлялася асноўным рэгулятарам сацыяльных адносін у вёсцы ў дачыненні да розных груп насельніцтва. Нягледзячы на тое што перавага надавалася прамому падаткаабкладанню, разам з мясцовымі зборамі сяляне ўносілі больш за 10 плацяжоў. У якасці аб'ектаў падаткаабкладання вяскоўцаў выступалі зямля, жывёла, іншая маёмасць, прыбытак і г. д.

Каб спыніць распад калгасаў, Прэзідыум ЦВК БССР у лютым 1928 г. прыняў спецыяльную пастанову, якая забараняла размеркаванне калгаснай зямлі. У 1929 г. была забаронена хутарская форма землеўпарадкавання. Падчас суцэльнай калектывізацыі адносіны да хутароў шмат у чым нагадвалі сітуацыю часоў ваеннага камунізму. Дзякуючы звароту да А. Р. Чарвякова стала вядомай сітуацыя з землеўпарадкаваннем саўгаса імя Молатава Камарынскага раёна, калі 72 хутарскія гаспадаркі ссялілі з іх зямель, выдзеліўшы зямельную плошчу (не зусім прыдатную для земляробства) за 12–13 км ад сядзіб гаспадароў. У далейшым такія дзеянні дзяржаўных чыноўнікаў, што кваліфікаваліся напачатку як «лявацкія загібы», былі выкарыстаны для справы аб шкодніцкай арганізацыі ў Наркамаце земляробства БССР[15].

Пазней, у сярэдзіне 1930-х гг., сам А. Р. Чарвякоў вымушаны быў даваць паказанні аб тым, што быццам бы па ўказанні польскіх улад у БССР насаджаліся хутары. Пачатак новай кампаніі супраць кіраўніцтва Беларусі быў звязаны з артыкулам у газеце «Праўда», у адказ на які начальнік аддзела землеўпарадкавання і меліярацыі Наркамата земляробства БССР пераадрасаваў абвінавачанні на адрас саюзнага Навукова-даследчага інстытута арганізацыі тэрыторыі[16]. У перапісцы разгортвалася сапраўдная трагедыя беларускіх сялян. Яны не толькі былі прымусова аб'яднаны ў калгасы. У надзвычай хуткіх тэмпах яны павінны былі перанесці свае дамы і пабудовы ў калгасныя сядзібы. Заўважна, што Наркамат земляробства БССР, лепш валодаючы сітуацыяй, прапаноўваў ліквідаваць і дробныя пасёлкі да 20 двароў (пры гэтым калгасы ўжо арыентавалі на брыгадны метад працы)[17]. Разам з тым мерапрыемствы, звязаныя з паскарэннем ліквідацыі хутароў, аўтар пісьма зводзіў да ініцыятывы «класавага ворага»[18]. У чэрвені 1938 г. на XVII з'ездзе ЦК КП(б)Б канстатавалася, што «дзякуючы таварышу Сталіну» ў ЦК КП(б)Б была выкрыта «нацыянал-фашысцкая групоўка», якая «рабіла ўсё, каб адарваць нашу савецкую рэспубліку ад вялікай сям'і народаў і перадаць беларускі народ у лапы крывавага фашызму»[19]. Напярэдадні

[11]НАРБ. Ф. 4п. Оп. 1. Д. 2520. (Протоколы заседания Пленума ЦК КП(б)Б от 12–15 марта 1926). Л. 18.
[12]Отчет НКФ об исполнении Гос.бюжета БССР за 1926–1927 гг. // НАРБ. Ф. 4п. Оп. 1. Д. 2732. Л. 8–10, 20.
[13]Стенограмма XI съезда КП(б)Б от 22 – 29 ноября 1927 г. 813 л. // НАРБ. Ф. 4п. Оп. 1. Д. 3090. Л. 1.
[14]Там же. Л. 189.
[15]Протокол № 19 заседания секретариата ЦК КП(б)Б от 19 июня 1932 г., документы к нему // НАРБ. Ф. 4 п. Оп. 1. Д. 5669. Л. 245.
[16]Докладная записка начальника отдела землеустройства и мелиорации Наркомзема БССР И. С. Фридмана в ЦК ВКП(б) от 26 мая 1935 г. о его несогласии со статьей по вопросу землеустройства в БССР, помещенной в газете «Правда» от 25 марта 1935 г. // НАРБ. Ф. 4п. Оп. 1. Д. 9050.
[17]Там же. Л. 5.
[18]Там же. Л. 11.
[19]Стенограмма XVII съезда ЦК КП(б)Б. 2-й экз. // НАРБ. Ф. 4п. Оп. 1. Д. 12263. Л. 11.

АДПУ БССР была падрыхтавана дакладная запіска «Аб шкодніцкім зрыве рашэнняў ЦК УКП(б) і СНК СССР ад 11 кастрычніка 1937 г. аб мерапрыемствах па сцягванні хутароў у БССР». У ёй канстатавалася наяўнасць 159 587 хутарскіх гаспадарак, што складала 16–18 % усіх двароў. Пры гэтым у Мсціслаўскім, Суражскім, Сіроцінскім і Ліёзненскім паветах яны ўтваралі абсалютную большасць гаспадарак (ад 59 да 93 %)[20]. Асаблівы клопат АДПУ складала тое, што значная частка хутароў знаходзілася ўздоўж мяжы і стала базай для антысавецкай дзейнасці. Стварэнне хутарскіх гаспадарак у Беларусі звязвалі не толькі з П. А. Сталыпіным, але і з Д. Ф. Прышчэпавым (не прымалася пад увагу, што большасць хутароў у савецкі час узніклі да яго прызначэння на пасаду наркама земляробства БССР). Да справы былі далучаны абвінавачанні не толькі на яго адрас, але і ў бок «польскага шпіёна» У. М. Ігнатоўскага, а таксама сведчанні былога наркама земляробства БССР К. Ф. Бенека, згодна з якімі хутарызацыя ў БССР мела дзяржаўную падтрымку, што садзейнічала невыкананню планаў па калектывізацыі (87,1 % – ніжэй, чым у сярэднім па СССР). Ссяленне з хутароў і дробных пасёлкаў закранула дзясяткі тысяч гаспадарак. Прапанову аб перасяленні 50 тыс. гаспадарак пры абмеркаванні плана землеўпарадкавальных работ кіраўнік АДПУ БССР Б. Д. Берман аднёс да выступлення першага сакратара ЦК КП(б)Б М. І. Галадзеда. У выніку меркавалася ў 1937 г. ссяліць з хутароў 3100 гаспадарак, а на працягу 1938 г. з памежнай зоны – 22 718 двароў[21].

Ліквідацыя індывідуальнай гаспадаркі ва ўмовах спецыялізацыі ў кірунку да мяса-малочнай вытворчасці выклікала найперш істотнае скарачэнне жывёлы, нарыхтовак мясной і малочнай прадукцыі. Партыйнае кіраўніцтва напачатку дзейнічала па звыклым шаблоне, выкарыстоўваючы адміністрацыйныя магчымасці. Згодна з рашэннем Сакратарыята ЦК КП(б)Б ад 24 кастрычніка 1932 г., былі размеркаваны планы мясанарыхтовак, якія даводзіліся да ўзроўню кожнага раёна, кожнай сялянскай сям'і. Асноўны цяжар быў ускладзены на калгасныя двары і сялянскія індывідуальныя гаспадаркі (каля 80 %)[22]. З 1933 г. дзяржавай акцэнтуюцца падатковыя стымулы для калектывізацыі. У выніку падаткі з адзінкі зямельнай плошчы для індывідуальнай гаспадаркі ў 20–30 разоў перавышалі нормы падатку для калгасаў. Да таго ж у калгаснікаў не абкладаліся падаткам пасевы лёну, жывёла (буйная і дробная) і прадукцыя пчалаводства. У сувязі з рэзкім скарачэннем жывёлы для стымулявання развіцця жывёлагадоўлі і малочнай гаспадаркі ў 1933 г. не абкладаўся падаткам увесь прырост (у супастаўленні з 1932 г.) пагалоўя кароў, быкоў і авечак і ў індывідуальнай гаспадарцы. Для сялян найбольш выгаднымі станавіліся пасевы цукровых буракоў і лёну, якія вызваляліся ад падаткаабкладання. Увогуле падаткі для вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі ў БССР былі ў ліку высокіх па асноўных яе відах у параўнанні з іншымі рэспублікамі СССР. Сялянства Беларусі вынікамі сваёй працы ўнесла істотны ўклад у фарміраванне індустрыяльнай магутнасці СССР.

Прыняцце ў лютым 1935 г. на ІІ з'ездзе калгаснікаў-ударнікаў прыкладнага статута сельскагаспадарчай арцелі дало адзінаасобнікам спадзяванне на тое, што пры ўступленні ў калгас яны захаваюць падсобную гаспадарку. У спалучэнні з наступам на індывідуальную гаспадарку гэта садзейнічала росту тэмпаў калектывізацыі ў многіх рэгіёнах, у тым ліку ў БССР. Прысядзібныя надзелы часткова заспакоілі сялянства, задаволілі іх уласніцкія патрэбы. Аднак дуалізм спарадзіў новыя супярэчнасці. Прысядзібныя надзелы калгаснікі імкнуліся максімальна павялічыць, выкарыстоўваючы складанасці з землеўпарадкаваннем. Даволі часта яны трактавалі тыя ці іншыя нормы на сваю карысць. У трэцім пункце пастановы СНК СССР было адзначана, што пры надзяленні калгаснікаў сядзібай ім адводзіцца не болей за 0,5 га зямлі. Аднак асобныя землямеры прыпісвалі перад гэтай лічбай словы «не меней»[23]. Паступова спеў дуалізм і ў свядомасці селяніна, выяўляючыся ў яго эканамічных паводзінах. Калгаснікі імкнуліся больш часу правесці на сваёй гаспадарцы, бо за калектыўную яны амаль нічога не атрымлівалі.

Такім чынам, развіццё індывідуальнай сялянскай гаспадаркі на працягу даследуемага перыяду характарызуецца супярэчлівымі тэндэнцыямі. Да сярэдзіны 1920-х гг. не было створана істотных стымулаў для яе развіцця. Аднаўленчы працэс у беларускай вёсцы адбываўся пераважна за кошт экстэнсіўных фактараў: павелічэння затрат жывой працы, пашырэння землекарыстання – рэсурсаў, якія да сярэдзіны 1920-х гг. былі ўжо вычарпаны. Не назіралася і росту таварнай прадукцыі, тыповая серадняцкая гаспадарка заставалася напалову натуральна-спажывецкай. Рост спажывання хлеба самімі сялянамі, а таксама павелічэнне выдаткаў на корм жывёле прадвызначылі залежнасць БССР ад сітуацыі ў хлебавытворчых рэгіёнах СССР.

Аграрная перанаселенасць паглыбляла спажывецкі характар гаспадаркі. Ва ўмовах сістэматычных змен у падыходах да надзялення зямлёй нават максімальныя і мінімальныя нормы землекары-

[20]Стенограмма XVII съезда ЦК КП(б)Б. 2-й экз. // НАРБ. Ф. 4п. Оп. 1. Д. 12263. Л. 189.
[21]Там же. Л. 78–95.
[22]Протокол № 19 заседания секретариата ЦК КП(б)Б от 19 июня 1932 г., документы к нему // НАРБ. Ф. 4 п. Оп. 1. Д. 5669. Л. 1.
[23]Спецсовещания, докладные и справки органов НКВД // НАРБ. Ф. 4п. Оп. 1. Д. 12055.

стання, уведзеныя для больш рацыянальнага размеркавання зямельных плошчаў і рэалізацыі працоўнага прынцыпу ў зямельнай палітыцы, выклікалі незадаволенасць сялянства. Урэшце, не толькі вынікі вытворчасці ўплывалі на выбар сялянамі форм землекарыстання, але і перспектывы землеўладкавання. Па меры абмежавання выхаду на хутары ў сялянства ўзрастала імкненне да стварэння сельскагаспадарчых калектываў.

Уніфікацыя і паскораныя тэмпы калектывізацыі пазбавілі беларускую вёску магчымасцей мадэрнізацыі з улікам асаблівасцей яе гістарычнага развіцця і прыродна-геаграфічных умоў пры пераваге на той час «біялагічных» працэсаў. Аднак спалучэнне пераваг буйной і дробнай гаспадаркі спецыфічным чынам рэалізавалася з улікам захавання асабістай гаспадаркі калгаснікаў, якая ва ўмовах выняцця прадукцыі калгасаў станавілася не толькі крыніцай пражыцця вяскоўцаў, але і істотным фактарам сельскагаспадарчай вытворчасці ў такіх галінах, як бульбаводства, мяса-малочная гаспадарка і кустарніцтва.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Ходзін СМ. *Беларуская вёска ў міжваенны час: шляхі і формы савецкай мадэрнізацыі (1921–1939).* Мінск: БДУ; 2014. 240 с.

2. *Статыстычны даведнік і каляндар з запісной кніжкай для статыста-карэспандэнта на 1927 год.* 6-е выд. Мінск : Цэнтральная статыстычная ўправа; 1927. 428, IV с.

3. Прищепов Д. Мероприятия по восстановлению сельского хозяйства Белоруссии. *Вперед.* 1924;2:52–58.

4. Кіслякоў Я. *Пасёлкі (оптымум тэрыторыі і эфект землеўпарадкавання).* Мінск: Беларускі навукова-даследчы інстытут сельскай і лясной гаспадаркі; 1928. 256 с.

5. Маслов ПП. Развитие сельского хозяйства до и после революции, 9 октября 1927 г. *Известия ЦК КПСС.* 1989;10:192–219.

6. Ходзін СМ. Беларуская вёска ў 1920–30-я гг.: крыніцы, метады, вынікі вывучэння. У: Яноўскі АА, рэдактар. *Выбраныя навуковыя працы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, 1921–2001. Том 2. Гісторыя. Філасофія. Журналістыка.* Мінск: БДУ; 2001. с. 109–118.

7. Ходзін СМ. Дзяржаўнае будаўніцтва ў Беларусі ў 1920-я гг. У: Коршук УК, рэдактар. *Працы гістарычнага факультэта БДУ. Выпуск 6.* Мінск: БДУ; 2011. с. 109–115.

8. Прышчэпаў З. Задачы рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ў сёлетнюю пасеўкампанію. *Савецкае будаўніцтва.* 1928;3/4:53–62.

9. Миронов БН. *Российская империя: от традиции к модерну. Том 1.* Санкт-Петербург: Дмитрий Буланин; 2014. 896 с.

10. Макараў МП. *Спроба вывучэння эфектыўнасці форм землекарыстання ў БССР.* Мінск: [б. в.]; 1929. (Працы Беларускага навукова-даследчага інстытута сельскай і лясной гаспадаркі пры СНК БССР. Том 7, выпуск 5).

11. Бусько ВН. *Экономическая мысль Беларуси в период НЭПа (20-е годы).* Минск: Право и экономика; 2000. 279 с.

12. Siebert D. *Bäuerliche Alltagsstrategien in der Belarussischen SSR (1921–1941): die Zerstörung patriarchalischer Familienwirtschaft.* Stuttgart: F. Steiner; 1998. 414 S. (Quellen und Studien zur Geschichte des östlichen Europa. № 52).

13. Липинский ЛП. *Столыпинская аграрная реформа в Белоруссии.* Минск: Издательство Белорусского государственного университета; 1978. 221 с.

14. Ремизов ИВ, редактор. *Перспективный план развития сельского и лесного хозяйства БССР на 1925/26–1929/30 гг.: утвержден Правительством.* Минск: Издательство Народного комиссариата земледелия БССР; 1927. VIII, 960 с.

*15. Асноўныя вынікі работы Ураду БССР. Да перавыбару Саветаў 1928/29 г. Мінск*: Выдавецтва УВК і СНК СССР; 1928. 150 с.

16. *Материалы к докладу Совета Народных Комиссаров БССР Совету Народных Комиссаров СССР.* Минск: Управление делами СНК БССР; 1928. 248 с.

## References

1. Khodzin SM. *Belaruskaja vjoska w mizhvaenny chas: shljahi i formy saveckaj madjernizacyi (1921–1939)* [Belarusian village during the interwar period: the ways and forms of Soviet modernization (1921–1939)]. Minsk: Belarusian State University; 2014. 240 p. Belarusian.

2. *Statystychny davednik i kaljandar z zapisnoj knizhkaj dlja statysta-karjespandjenta na 1927 god* [Statistical handbook and calendar with a notebook for supernumerary correspondent to 1927]. 6$^{th}$ edition. Minsk: Central Statistical Office; 1927. 428, IV p. Belarusian.

3. Prishchepov D. [Events for the restoration of agriculture of Belarus]. *Vpered*. 1924;2:52–58. Russian.

4. Kisljakow Ja. *Pasjolki (optymum tjerytoryi i jefekt zemlewparadkavannja)* [Village (optimum area and effect zemlevparadkavannya)]. Minsk: Belarusian Research Institute of Agriculture and Forestry; 1928. 256 p. Belarusian.

5. Maslov PP. [Development of agriculture before and after the revolution, 1927 October 9]. *Izvestiya TsK KPSS.* 1989;10:192–219. Russian.

6. Khodzin SM. [Belarusian village in the 1920–30s: sources, methods, results of the study]. In: Janowski AA, editor. *Vybranyja navukovyja pracy Belaruskaga dzjarzhawnaga wniversitjeta, 1921–2001. Tom 2. Gistoryja. Filasofija. Zhurnalistyka* [Selected scientific works of the Belarusian State University, 1921–2001. Volume 2. History. Philosophy. Journalism]. Minsk: Belarusian State University; 2001. p. 109–118. Belarusian.

7. Khodzin SM. [State-building in Belarus in the 1920s]. In: Korshuk UK, editor. *Pracy gistarychnaga fakul'tjeta BDU. Vypusk 6* [Proceedings of the historical faculty of Belarusian State University. Issue 6]. Minsk: Belarusian State University; 2011. p. 109–115. Belarusian.

8. Prishchepov Z. [Tasks reconstruction of agriculture in the current sowing campaign]. *Saveckae budawnictva*. 1928: 3/4;53–62. Belarusian.

9. Mironov BN. *Rossiiskaya imperiya: ot traditsii k modernu. Tom 1* [Russian Empire: from tradition to modernity. Volume 1]. Saint Petersburg: Dmitry Bulanin; 2014. 896 p. Russian.

10. Makarov MP. *Sproba vyvuchjennja jefektywnasci form zemlekarystannja w BSSR* [Trying to study the effectiveness of land use in the Byelorussian SSR]. Minsk: Publisher unknown; 1929. (Proceedings of the Belarusian Scientific Research Institute of Agriculture and Forestry under the BSSR. Volume 7, issue 5). Belarusian.

11. Busko VN. *Ekonomicheskaya mysl' Belarusi v period NEPa (20-e gody)* [The economic thought of Belarus in the period of the NEP (1920s)]. Minsk: Pravo i ekonomika; 2000. 279 p. Russian.

12. Siebert D. *Bäuerliche Alltagsstrategien in der Belarussischen SSR (1921–1941): die Zerstörung patriarchalischer Familienwirtschaft.* Stuttgart: F. Steiner; 1998. 414 S. (Quellen und Studien zur Geschichte des östlichen Europa. No. 52). German.

13. Lipinski PL. *Stolypinskaya agrarnaya reforma v Belorussii* [Stolypin agrarian reform in Belarus]. Minsk: Izdatel'stvo Belorusskogo gosudarstvennogo universiteta; 1978. 221 p. Russian.

14. Remizov IV, editor. *Perspektivnyy plan razvitiya sel'skogo i lesnogo khozyaistva BSSR na 1925/26–1929/30 g.: utverzhden Pravitel'stvom* [The prospective plan for the development of agriculture and forestry in the BSSR for 1925/26–1929/30: approved by the Government]. Minsk: Izdatel'stvo Narodnogo komissariata zemledeliya BSSR; 1927. VIII, 960 p. Russian.

15. *Asnownyja vyniki raboty Uradu BSSR. Da peravybaru Savetaw 1928/29 g.* [The main results of the work of the BSSR Government. For re-election of the Soviets 1928/29]. Minsk: Vydavectva UVK i SNK SSSR; 1928. 150 p. Belarusian.

16. *Materialy k dokladu Soveta Narodnykh Komissarov BSSR Sovetu Narodnykh Komissarov SSSR* [Materials to the report of the Council of People's Commissars of the BSSR to the Council of People's Commissars of the USSR]. Minsk: Upravleniye delami SNK BSSR; 1928. 248 p. Russian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 14.12.2018.*
*Received by editorial board 14.12.2018.*